

## СКУБА Яніна Вікенцьеўна

Нарадзілася ў 1927 годзе ў в.Лебядзі Зэльвенскага раёна.

Свой працоўны шлях пачала ў 15-гадовым узросце пасля заканчэння пачатковай школы. Працавала ў сельскай гаспадарцы. З 1966 года – даярка малочна-таварнай фермы Лебядзі. За час працы ў гаспадарцы зарэкамендавала сябе добрасумленным і адказным работнікам.

Ёй прысвоены званні “Заслужаны калгаснік”, “Ударнік камуністычнай працы”, “Майстар жывёлагадоўлі 1-га класа”.

За праяўленую працоўную доблесць узнагароджана ордэнам “Працоўнага Чырвонага Сцяга”, медалямі “За добрасумленную працу”, “За працоўную выдатнасць”, бронзавым медалём ВДНГ, юбілейным медалём да 100-годдзя У.І.Леніна.

Пастановай праўлення калгаса “Прагрэс”, партыйнага камітэта і прафкама калгаса ад 27.02.1981 г. за вялікія заслугі ў развіцці калгаснай вытворчасці Скуба Я.В. занесена ў кнігу Працоўнай Славы гаспадаркі.